УДК [94(476) +3 54(476)(091)]“1965/1985”

## ЗМЕНЫ Ў АПАРАЦЕ УРАДА БЕЛАРУСКАЙ ССР (1965–1985 гг.)

**Мазец Валянцін Генрыхавіч**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

Важнае месца ў дзейнасці Савета Міністраў Беларускай ССР – належала спецыяльнаму органу – апарату Урада Беларускай ССР. У адпаведнасці з Законам БССР “Аб Савеце Міністраў Беларускай ССР”, прынятым у 1979 г., апаратам Урада Беларускай ССР, які ажыццяўляе падрыхтоўку пытанняў для разгляду ў Савеце Міністраў БССР і забяспечвае праверку выканання, з’яўляецца Упраўленне Справамі Савета Міністраў Беларускай ССР.

У 1965–1969 гг. апарат Урада Беларускай ССР ўзначальваў Іван Кузьміч Казлоў, які займаў гэтую пасаду з 1961 г. У 1969 г. яго на пасадзе кіраўніка Справамі Савета Міністраў Беларускай ССР змяніў Фёдар Іванавіч Самбук. З 1980 гэтую пасаду займаў Леў Георгіевіч Максімаў.

Структура і штаты Упраўлення Справамі Савета Міністраў БССР на працягу разглядаемага дваццацігоддзя змяняліся ў адпаведнасці са зменамі ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці рэспублікі.

У адпаведнасці з дадаткам №1 да Пастановы Савета Міністраў Беларускай ад 16 ліпеня 1965 г. № 375 “Аб зацвярджэнні структуры і штатнага раскладу апарата Савета Міністраў Беларускай ССР” у апараце Урада функцыянавала 21 структурнае падраздзяленне, у тым ліку 11 аддзелаў, у якіх налічвалася 161 штатная адзінка з фондам месячнай зарплаты 31905 рублёў [1, арк. 252].

Пастановаю Савета Міністраў БССР ад 30 снежня 1965 г. “Аб частковай змене структуры і штатнага раскладу апарата Савета Міністраў БССР” са структуры і штатнага расклада апарата Савета Міністраў БССР былі выключаныя аддзелы: прамысловы, бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці, будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі, планава-фінансавы і гандлю, навукі, прасветы (асветы) і сацыяльна-культурных устаноў. Уводзіліся у структуру Савета Міністраў БССР наступныя аддзелы: саюзнай і саюзна-рэспубліканскай прамысловасці; мясцовай прамысловасці, бытавога абслугоўвання, гандлю і камунальнай гаспадаркі; планава-фінансавы; прасветы, аховы здароўя і культуры, навукі і тэхнікі [2, арк. 174–178]. Прадугледжвалася павелічэнне апарата Савета Міністраў БССР на 10 адзінак з фондам заработнай платы 2130 рублёў у месяц [2, арк. 173].

У наступныя гады адбывалася павелічэнне штату і фонда месячнай зарплата апарату Савета Міністраў Беларускай ССР.

Паводле штатнага раскладу апарата Савета Міністраў Беларускай ССР на 1969 год у апараце налічвалася 22 структурных падраздзяленні, у тым ліку 12 аддзелаў, 178 штатных адзінак з фондам месячнай зарплаты 35510 рублёў [3, арк. 1].

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР ад 8 мая 1970 г. прадугледжвалася “Унесці змены ў структуру і штатны расклад апарату Савета Міністраў БССР, скарацўшы колькасць работнікаў апарату Савета Міністраў БССР на 3 адзінкі з фондам заработнай платы 545 рублёў у месяц” [4, арк. 23]. Са структуры апарата выключаліся аддзел саюзнай і саюзна-рэспубліканскай прамысловасці, аддзел мясцовай прамысловасці, бытавога абслугоўвання, гандлю і камунальнай гаспадаркі, а таксама 1 штатная адзінка сакратара-машыністкі ў канцылярыі агульнага аддзела і ўводзіліся прамысловы аддзел і група гандлю і бытавога абслугоўвання [4, арк. 24–26]. Праз два гады, распараджэннем Савета Міністраў БССР ад 5 чэрвеня 1972 г., група гандлю і бытавога абслугоўвання была пераўтворана ў аддзел гандлю і бытавога абслугоўвання, што абумовіла павелічэнне фонду месячнай зарплат на 100 рублёў [5, арк. 11].

8 студзеня 1975 г. Савет Міністраў БССР пастанавіў: “Павялічыць колькасць работнікаў апарата Упраўлення Справамі Савета Міністраў Беларускай ССР на 25 адзінак з фондам заработнай платы 5415 рублёў у месяц” [6, арк. 9].

У выніку, на падставе штатнага раскладу, зацверджанага пастановай Савета Міністраў БССР ад 8 студзеня 1975 г. апарат Савета Міністраў БССР ў 1976 г. складаўся з 22 структурных падраздзяленняў, але ўжо 14 аддзелаў. У апараце налічвалася 214 штатных адзінак з фондам месячнай зарплаты 43045 руб. [7, арк. 7].

У параўнанні з 1965 годам апарат павялічыўся на 53 структурныя адзінкі, а фонд месячнай зарплаты вырас на 11140 рублёў.

Пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР ад 1 чэрвеня 1976 г. было прынята рашэнне увесці ў штатны расклад Упраўлення Справамі Савета Міністраў БССР дадаткова адну адзінку намесніка Кіраўніка Справамі Савета Міністраў БССР



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з акладам 340 рублёў у месяц і адну адзінку сакратара прыёмнай Упраўлення Справамі з акладам 85 рублёў у месяц, выключыўшы з штатнага раскладу адну адзінку дарадцы з фондам заработнай платы 50 рублёў у месяц [7, арк. 1].

Пасля праведзенай рэарганізацыі ў штатным раскладзе апарата Савета Міністраў Беларускай ССР на 1977 год прадугледжвалася 216 штатных адзінак з месячным фондам зарплаты 43940 рублёў.

На працягу 1977–1980 гг. ў структуры апарату Савета Міністраў Беларускай ССР адбыліся нязначныя змены. У 1977 г. згодна са штатным раскладам былі ліквідаваныя штатныя адзінкі дарадцаў пры Савеце Міністраў БССР [8, арк. 6]. У 1979 году пратакольная частка была перайменавана ў пратакольную групу [9, арк. 12].

Паводле штатнага раскладу на 1980 год у апараце Савета Міністраў БССР налічвалася 241 штатная адзінка і з месячным фондам зарплаты 52790 рублей [10, арк. 8].

У 1980 г. у адпаведнасці з распараджэннем Савета Міністраў БССР ад 29 мая 1979 г. была створана група па абслугоўванню замежных дэлегацый і гасцей [11, арк. 160]. На падставе штатнага раскладу, зацверджанага распараджэннем Савета Міністраў БССР ад 24 кастрычніка 1979 г. у 1980 годзе былі ўтвораны дзесяты аддзел, група збору, аналізу і апрацоўкі інфармацыі, пункт інфармацыі і сувязі, група па грамадзянскай абароне [10, арк. 20–21].

Гэтыя пераўтварэнні суправаджаліся як павелічэннем штату работнікаў апарата, так і фонда месячнай зарплаты. Так у адпаведнасці са штатным раскладам, у структуры апарата Савета Міністраў БССР у 1981 г. налічвалася 253 штатных адзінкі з месячным фондам зарплаты 58012 рублёў 50 капеек [12, арк. 12].

8 чэрвеня 1981 г. Кіраўнік Справамі Савета Міністраў БССР Леў Георгіевіч Максімаў звярнуўся да міністра фінансаў БССР Баляслава Іосіфавіча Шацілы з просьбай павялічыць колькасць работнікаў галіновых аддзелаў, а таксама ўнесці асобныя змены ў структуру Упраўлення Справамі, а менавіта павялічыць штаты апарата на 20 адзінак. Матывавалася гэта тым, што "пастаянна павялічваецца колькасць дакументаў, якія паступаюць у Савет Міністраў БССР. Значна павышаны патрабаванні да работнікаў Упраўлення Справамі Савета Міністраў БССР па кантролі і праверцы выканання рашэнняў Партыі і Урада, указанняў і даручэнняў кіраўніцтва Савета Міністраў БССР, падрыхтоўцы неабходных матэрыялаў, якія падлягаюць разгляду на пасяджэннях Савета Міністраў БССР і Прэзідыума Савета Міністраў БССР" [13, арк. 122].

Распараджэннем Савета Міністраў БССР ад 4 лістапада 1981 г. быў створаны аддзел энергетыкі, паліва і матэрыяльных рэсурсаў, а група знешнеэканамічных сувязяў і выставак ператорана ў аддзел знешнеэканамічных сувязяў і выставак.

18 сакавіка 1982 г. Савет Міністраў БССР зацвердзіў Палажэнне аб Упраўленні Справамі Савета Міністраў БССР, у адпаведнасці з якім Упраўленне Справамі Савета Міністраў БССР з'яўлялася апаратам Урада БССР, які ажыццяўляе падрыхтоўку пытанняў для разгляду ў Савеце Міністраў БССР і забяспечвае сістэматычную праверку выканання рашэнняў Партыі і Урада [14, арт. 139].

Асноўнымі задачамі Упраўлення Справамі Савета Міністраў БССР з'яўляліся: аператыўная і якасная падрыхтоўка праектаў рашэнняў Савета Міністраў БССР; сістэматычны аналіз стану адпаведных галін народнай гаспадаркі, выяўленне актуальных пытанняў іх развіцця і найбольш важных міжгаліновых праблем; ажыццяўленне пастаяннага кантролю за ходам выканання дзяржаўных планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця і інш. На Ўпраўленні Справамі Савета Міністраў БССР ўскладалася: падрыхтоўка праектаў планаў работы Савета Міністраў БССР і Прэзідыума Савета Міністраў БССР і забеспячэнне кантролю за іх выкананнем; падрыхтоўка дакладаў Старшыні Савета Міністраў БССР і яго намеснікам дакументаў па разглядаемых імі пытаннях; арганізацыйна-тэхнічная падрыхтоўка пасяджэнняў Савета Міністраў БССР і Прэзідыума Савета Міністраў БССР; афармленне праектаў пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў БССР і г.д. [15, арк. 132–145].

У адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў БССР ад 2 ліпеня 1982 г. быў скасаваны аддзел сельскай гаспадаркі і на яго базе створаны аддзел аграпрамысловага комплексу, а аддзел лёгкай і харчовай прамысловасці пераўтвораны ў аддзел лёгкай прамысловасці і тавараў народнага спажывання [16, арк. 18].

У 1983 г. на падставе штатнага раскладу у структуру апарата Савета Міністраў БССР была ўведзена Камісія Прэзідыума Савета Міністраў БССР па пытаннях аграпрамысловага комплексу, утвораная ў адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў БССР ад 2 ліпеня 1982 г. [17, арк. 1–12].

Распараджэннем Савета Міністраў БССР ад 23 студзеня 1984 г. быў створаны аддзел адміністрацыйных органаў, а распараджэннем Савета Міністраў БССР ад 20 лютага 1984 г. – група па абслугоўванню замежных дэлегацый і гасцей ўключана ў склад гаспадарчага кіравання [18, арк. 95]. Паводле распараджэння Савета Міністраў БССР ад 9 снежня 1985 г. у аддзеле энергетыкі, паліва і матэрыяльных рэсурсаў быў створаны сектар энергетыкі і паліва сектар матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, а з аддзела аграпрамысловага комплексу выключаны сектар харчовай і перапрацоўчай прамысловасці [19, арк. 46–48].

У адпаведнасці са штатным раскладам на 1985 год у апараце Савета Міністраў БССР налічвалася 28 структурных падраздзяленняў, у тым ліку 19 аддзелаў, 274 штатных адзінкі з месячным фондам зарплаты 66248 рублёў 25 капеек [20, арк. 1–12].

Такім чынам, на працягу разгледжанага перыяду склалася ўстойлівая тэндэнцыя павелічэння колькасці структурных падраздзяленняў апарата Савета Міністраў БССР з 21 да 28 (або на 25%), штатных адзінак са 161 да 274 (на 41%), а рост фонда месячнай зарплаты склаў амаль 52% (з 31 905 рублёў да 66248 рублёў 25 капеек). Такія змены былі звязаныя перш за ўсё ростам міністэрстваў і ведамстваў БССР. Так, калі ў 1967 г. ў рэспубліцы функцыянавала 25 міністэрстваў і 12 ведамстваў, то ў 1985 г. – 30 міністэрстваў і 16 ведамстваў. А так як, адной з асноўных задач Упраўлення Справамі Савета Міністраў БССР з'яўлялася аператыўная і якасная падрыхтоўка праектаў рашэнняў Савета Міністраў БССР, то памеры працы безумоўна істотна павялічыліся, што і абумовіла рост штатнага складу апарату Урада Беларускай ССР.

ЛІТАРАТУРА


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1134.
2. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1153.
3. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2726.
4. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2736.
5. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3523.
6. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 4620.
7. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 5530.
8. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 5957.
9. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 6783.
10. НА РБ – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 7269.
11. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 6517.
12. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 7792.
13. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 7529.
14. Збор законаў указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў Беларускай ССР, 1982, № 9.
15. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 7799.
16. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 7805.
17. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 8852.
18. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 9042.
19. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 9587.
20. НА РБ. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1000.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова